16. НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 621.
17. НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 1949.
18. НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 3268.
19. НГАБ. Ф. 694. Воп. 4. Спр. 2861.
20. Ольшамовский Б.Г. Права по землевладению в Западном крае. Санкт-Петербург: Ю.А. Мансфельдт, 1899.
21. Попко О.Н. Князья Витгенштейны и их владения в Российской Империи в XIX веке. Мир: Музей «Замковый комплекс «Мир», 2018.
22. Прошение поверенного князя Антона Радзивилла, присяжного поверенного Витвинского, об отмене решения Виленской судебной палаты по иску князя Радзивилла к Руликовским и Глембоцкому, в правах коих вступил, в качестве ответчика, граф Иван Канкрин, о правах собственности на лесную дачу Россия. Сенат. Гражданский кассационный департамент.Решения Гражданскаго кассационнаго департамента Правительствующаго Сената. Петербург : Тип. Правительствующаго Сената, [1868–1916]. 1901. С. 286–292.
23. Прошение поверенных общества крестьян деревни Ольшаны, Евмена Чиникайло и Ивана Лемезы, об отмене решения Виленской судебной палаты по иску князя Антона Радзивилла к означенному обществу об изъятии из владения ответчика земель и о воспрещении ему пастьбы скота на этих землях и ловли рыбы Россия. Сенат. Гражданский кассационный департамент. Решения Гражданскаго кассационнаго департамента Правительствующаго Сената. Петербург: Тип. Правительствующаго Сената, [1868–1916]. 1903. С. 367–373
24. Российский государственный исторический архив (РГИА) Ф. 577. Оп. 50. Д. 2188.
25. РГИА. Ф. 577. Оп. 52. Д. 1265.
26. Россия. Законы и постановления. Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2. Санкт Петербург: в Тип. 2 Отд-ния Собств. е. и. в. Канцелярии, 1830–1885. Т. 50, отд-ние 1: 1875.

**УДК 323.1(476)**

# УДЗЕЛ ЛКСМБ У ПРАВЯДЗЕННІ ПАЛІТЫКІ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ

***А. У. Кімбар***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, andrejkimbar@gmail.com*

Артыкул прысвечаны вызначэнню дзеянняў, якія праводзіліся камсамолам Беларусі для ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі, ацэнцы іх эфектыўнасці. У рабоце прыведзены прыклады стаўлення шараговых камсамольцаў да рэалізацыі палітыкі беларусізацыі. Прадстаўлена дынаміка

рэалізацыі асноўных задач у сферы нацыянальна-культурнага будаўніцтва, пастаўленых перад ЛКСМБ партыйнымі і савецкімі органамі.

***Ключавыя словы:*** *беларусізацыя; ЛКСМБ; нацыянальна-культурная палітыка; БССР.*

## УЧАСТИЕ ЛКСМБ В ПРОВЕДЕНИИ ПОЛИТИКИ БЕЛАРУСИЗАЦИИ

***А. В. Кимбор***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, Минск, Беларусь, andrejkimbar@gmail.com*

Статья посвящена определению мероприятий, проводившихся комсомолом Беларуси по реализации политики белорусизации, и оценке их эффективности. В работе приведены примеры отношения рядовых комсомольцев к реализации политики белорусизации. Представлена динамика выполнения основных задач в области национально-культурного строительства, поставленных перед ЛКСМБ партийными и советскими органами.

***Ключевые слова:*** *белорусизация; ЛКСМБ; национальная и культурная политика; БССР.*

## PARTICIPATION OF LKSMB IN BELARUSIZATION POLICY

***A. Kimbar***

*Belarusian State University, Nezalezhnasti Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus, andrejkimbar@gmail.com*

The purpose of this work is to determine what actions were taken by the Komsomol of Belarus to implement the policy of Belarusianization, and to assess its effectiveness. The paper contains examples of the attitude of ordinary Komsomol members to the implementation of the policy of Belarusianization. The dynamics of the implementation of the main tasks in the field of national and cultural building set for the Lenin Communist Youth League of Belarus (LKSMB) by party and Soviet institutions are presented.

The article is devoted to the determination of the actions carried out by the Komsomol of Belarus to implement the policy of Belarusianization, and the assessment of their effectiveness. The work gives examples of the attitude of rank-and-file Komsomol members to the implementation of the Belarusianization policy. The dynamics of implementation of the main tasks in the field of national and cultural construction, set before the LKSMB by party and Soviet bodies, are presented.

***Keywords:*** *Belarusianization; LKSMB; national and cultural policy; BSSR.*

20-я гг. ХХ стагоддзя – вірлівы час станаўлення і ўмацавання Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Апроч значных сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў адбываюцца кардынальныя змены ў нацыянальна-культурнай палітыцы. Моладзь прымала актыўны ўдзел ва ўсіх гэтых працэсах. У гэты час адбываўся распад і расслаенне шэрагу маладзёжных арганізацый, а Камуністычны саюз моладзі Беларусі (з 1924 г. – Ленінскі камуністычны саюз моладзі Беларусі (далей ЛКСМБ)) упэўнена пераўтвараўся ў вядучую, а пасля адзіную маладзёжную грамадскую арганізацыю.

Актуальнасць дадзенага даследавання абумоўлена тым, што пры правядзенні нацыянальна-культурнай палітыкі ў сучаснай беларускай дзяржаве неабходна ўлічваць негатыўны і пазітыўны вопыт беларусізацыі 20-х гг. ХХ ст.

Мэта дадзенага даследавання – вызначыць, якія дзеянні праводзіліся камсамолам Беларусі для ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі, і даць адзнаку іх эфектыўнасці.

Усталяваўшыся на беларускіх землях, савецкая ўлада сутыкнулася з вялікай колькасцю нацыянальных супярэчнасцей, што засталіся ў гэтым рэгіёне пасля знішчэння царскай Расіі. Нацыянальныя і сацыяльныя фактары шчыльна перапляліся і прывялі да таго, што ўтварылася сітуацыя, у якой гарадское насельніцтва размаўляла на рускай мове, а насельніцтва вёскі ў сваёй большасці было беларускамоўным. Таму партыйным кіраўніцтвам была распрацаваная новая нацыянальна-культурная палітыка, якая ўлічвала асаблівасці рэгіёнаў. Для БССР такую палітыку прынята называць беларусізацыяй.

Пад беларусізацыяй у шырокім сэнсе гэтага слова належыць разумець такія мерапрыемствы і дзеянні, як развіццё беларускай культуры (школы, вышэйшыя навучальныя ўстановы на беларускай мове, беларуская літаратура, выданне беларускамоўных кніг, навукова-даследчая праца па ўсебаковым вывучэнні Беларусі і г.д.); вылучэнне беларусаў на партыйную, савецкую, прафесійную і грамадскую працу; перавод працы партыйнага, дзяржаўнага, прафесіянальнага, кааператыўнага апаратаў і частак Чырвонай арміі на беларускую мову [4, с. 9].

Папярэднія мерапрыемствы па правядзенні беларусізацыі, якія ажыццяўляліся да 1924 г. мелі нерэгулярны, нават хаатычны характар.

Даволі часта мерапрыемствы нацыянальнага накірунку праводзіліся па асабістай ініцыятыве некаторых прадстаўнікоў кіраўніцтва КП(б)Б (У. Ігнатоўскі, А. Бурбіс і іншых). Гэтыя нацыянальна-арыентаваныя палітыкі пераводзілі на беларускую мову падпарадкаваныя ім непасрэдна ўстановы [2, с. 76].

Афіцыйны пераход да палітыкі беларусізацыі замацоўваўся пастановай другой сесіі ЦВК БССР "Аб практычныя мерапрыемствах па правядзенні нацыянальнай палітыкі" ад 15 ліпеня 1924 г. Быў вызначаны тэрмін беларусізацыі дзяржаўных і грамадскіх устаноў, які складаў ад 1 да 5 гадоў [1, с. 129].

З 5 па 10 лютага 1926 г. праходзіў VIII з’езд Ленінскага Камсамола Беларусі, які акрамя задач эканамічна-прававой работы, працы з сялянскай моладдзю і піянерскімі арганізацыямі, разглядзеў таксама пытанні звязаныя з нацыянальнай палітыкай КП(б)Б. Так, па ўдзелу ў правядзенні нацыянальнай палітыкі Камуністычнай партыі, камсамол ставіў перад сабой шэраг задач [6, с. 24].

Матэрыялы гэтага дакладу дазваляюць нам казаць, што ў 1926 г. ЛКСМБ ужо вёў актыўную работу ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Ужо рабіліся значныя крокі па ўключэнні арганізацыі ў правядзенне беларусізацыі, разгортванню якой, аднак, перашкаджала недастаткова падрыхтаваная матэрыяльная база (адсутнасць літаратуры, адпаведных спецыялістаў).

Таксама паралельна з беларусізацыяй вялася нацыянальна-культурная работа і з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей, што пражывалі на тэрыторыі рэспублікі (палякі, латышы, яўрэі, літоўцы).

Немалаважным з’яўляецца і тое, што асаблівая ўвага надзяляецца дзейнасці суполкі “Маладняк”, якая паступова становіцца месцам згуртавання маладых беларускіх паэтаў і пісьменнікаў.

У красавіку 1928 г. адбыўся IX з’езд камсамола Беларусі. На гэтым з’ездзе абмяркоўваліся задачы першай працоўнай пяцігодкі, пашырэнне сеткі вячэрніх рабочых факультэтаў, школ працоўнай моладзі, вячэрніх школ павышанага тыпу, школ для малапісьменных. Таксама з’езд удзяліў значную ўвагу ажыццяўленню нацыянальна-культурнай палітыкі партыі [5, с. 20].

Пры параўнанні з матэрыяламі VIII з’езду бачна, што ЛКСМБ меў поспехі ў здзяйсненні палітыкі партыі адносна нацыянальнага пытання,

аб чым сведчыць прадстаўленая інфармацыя пра каранізацыю і працу з яўрэйскай моладдзю.

Перашкоды, з якімі сутыкнуліся дзеячы камсамола ў перыяд з VIII па IX з'езд, былі такімі ж, як і ў ранейшы перыяд дзейнасці ў гэтай галіне, а менавіта: адсутнасць неабходнай матэрыяльнай базы, якая была б здольная забяспечыць дабраякаснае правядзенне беларусізацыі, і адсутнасць патрэбнай колькасці спецыялістаў.

Варта адзначыць таксама, што на IX з'ездзе ЦК ЛКСМБ прызнаў вялікае палітычна-культурнае значэнне Усебеларускага аб'яднання пісьменнікаў і паэтаў "Маладняк". У далейшым на бюро ЦК ЛКСМБ былі праслуханыя справаздачы прадстаўнікоў камсамольская фракцыі аб'яднання "Маладняк". Але ўласна на з'ездзе прызнавалася, што праца ў галіне дапамогі "Маладняку" вядзецца на нізкім узроўні, і была пастаноўлена неабходнасць скіраваць увагу дзейнасці ЛКСМБ на дапамогу "Маладняку".

5 студзеня 1931 г. адбыўся X з'езд ЛКСМБ. На гэтым з'ездзе былі зачытаныя даклады М. Палякова і Я. Рубенчыка, у якіх закраналася нацыянальна-культурная праблематыка і ацэнка правядзення беларусізацыі. Так, сакратар ЦК ЛКСМБ М. Палякоў зазначае, што камасол Беларусі дабіўся значных поспехаў у галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва: Беларусь першая з рэспублік СССР прыступіла да правядзення ўсеагульнага абавязковага навучання, апярэдзіўшы план пяцігодкі, усеагульным навучаннем ахоплена 96,3% усіх падлягаючых гэтаму дзяцей.

Пры гэтым, у гэтай жа справаздачы адзначаецца, што ЦК ВЛКСМ канстатаваў у сваёй пастанове, што камсамольская арганізацыя Беларусі слаба ўдзельнічала ў нацыянальна-культурным будаўніцтве, стаяла ў баку ад барацьбы з актывізаваўшымся беларускім контррэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам і праявамі вялікадзяржаўнага шавінізму. Арганізацыя недаацэньвала значэнне правядзення беларусізацыі. Такая пастанова выклікала ў ЛКСМБ змяніць сваю канцэпцыю ўдзелу ў нацыянальна-культурным будаўніцтве. Беларусізацыя прызнаная адным з найважнейшых палітычных пытанняў [3, с. 48].

Вельмі цікавымі з'яўляюцца прыклады стаўлення шараговых камсамольцаў да палітыкі беларусізацыі. Так, напрыклад, у справаздачы сакратара ЦК ЛКСМБ М. Палякова апісваецца тое, што

адзін з камсамольцаў у ананімнай анкеце напісаў наступнае: ”Беларусізацыя зьяўляецца крокам назад у гісторыі культуры. Многамоўнасьць зьяўляецца бічом чалавецтва, і таму чалавецтва пад націскам чалавечай неабходнасьці стыхійна імкнецца да інтэрнацыяналізацыі моваў. Паміж тым, беларусізацыя, як працэс рэстаўрацыі адміраючай мовы зьяўляецца контр-рэвалюцыяй” [3, с. 49].

Дадзенае выказванне паказвае на тое, што далёка не ўсе камсамольцы былі згодныя з правядзеннем гэтай палітыкі і лічылі ўжыванне беларускай мовы непатрэбным. Яшчэ адзін прыклад – гэта выказванне члена Горацкай камсамольскай арганізацыі, які заявіў наступнае: “Хотя мы Пилсудского не похвалили за нажим белорусского языка, но и не нам зажимать русского языка” [3, с. 50]. Гэтыя словы зноў-такі ўказваюць на разыходжанне меркаванняў некаторых камсамольцаў з афіцыйнай лініяй беларусізацыі.

Ужо ў 1929 г. у нацыянальнай палітыцы КП(б)Б пачаліся карэнныя перамены. З абвяшчэннем генеральным сакратаром ЦК ВКП(б) І.В. Сталіным “крутога павароту ва ўсёй палітыцы” яна стала адлюстроўваць новы курс. Беларусізацыі ў ранейшым разуменні месца ў гэтай новай палітыцы ўжо не знайшлося. “Круты паварот” у беларусізацыі ў 1930-я гады прывёў амаль да поўнага яе згортвання.

Такім чынам, можна адзначыць, што ЛКСМБ дасягнуў пэўных поспехаў у рэалізацыі палітыкі беларусізацыі: праводзілася каранізацыя, справаводства пераводзілася на беларускую мову, адкрываліся курсы па вывучэнню мовы, праводзіліся лекцыйныя заняткі сярод шараговых членаў арганізацыі і насельніцтва краіны, падтрымлівалася літаратурная дзейнасць, у прыватнасці праца Усебеларускага аб’яднання пісьменнікаў і паэтаў “Маладняк”. Але ў той жа час, меўся і шэраг недахопаў: адсутнасць спецыялістаў, валодаючых беларускай мовай, адсутнасць неабходнай колькасці падручнікаў і кніг на беларускай мове, фармальнае выкананне пэўных пастаноў або наогул іх невыкананне, нежаданне вялікай колькасці камсамольцаў размаўляць па-беларуску.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Беларусізацыя, 1920-я гады: Дакакументы і матэрыялы / пад агульнай рэд. Р. П. Платонава і У. І. Коршука. Мінск: БДУ, 2001.
2. Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917–1945) / [М. С. Крот і інш.]. Мінск : Народная асвета, 1993.

3. Палякоў, М. Справаздача Цэнтральнага Камітэта ЛКСМБ на X з’ездзе / Дакл. т. М. Палякова; ЛКСМ Беларусі. Мінск : Выдавецтва ЦК ЛКСМБ, 1931.

4. Практычнае вырашэнне нацыянальнага пытання ў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай рэспубліцы: Да X гадавіны Кастрыцніцкай рэвалюцыі. Мінск: Нацыянальны камісарыят ЦВК БССР, 1928.

5. Рэзалюцыі і пастановы VIII Усесаюзнага з’езда УсеЛКСМ і IX з’езда ЛКСМБ; 1928. Мінск : Чырвоная зьмена, 1928.

6. Тэзисы докладов к VIII-му Всебелорусскому съезду ЛКСМБ. Минск., 1926.

**УДК 94(476)«1861/1914»+ 316.485**

# САЦЫЯЛЬНЫ КАНФЛІКТ ПАМІЖ БУЙНЫМІ ЗЕМЛЕЎЛАДАЛЬНІКАМІ І МАРГІНАЛЬНЫМІ КАТЭГОРЫЯМІ ШЛЯХТЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

***М. А. Крэнць***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, mkrents@bsu.by*

У артыкуле разглядаюцца асноўныя прычыны сацыяльнага канфлікту паміж буйнымі землеўладальнікамі і дробнай шляхтай на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Аналізуецца палітыка ўрада Расійскай імперыі і ўрадавыя мерапрыемствы. Аўтар прыходзіць да высновы, што прычынай канфлікту стала мэтанакіраваная палітыка ўрада і наступствы эканамічнага крызісу.

***Ключавыя словы***: *сацыяльны канфлікт; землеўладальнікі «польскага паходжання»; кантрыбуцыйныя мерапрыемствы; сацыяльная структура; абмежавальная палітыка; дробная шляхта.*

# СОЦИАЛЬНЫЙ КОНФЛИКТ МЕЖДУ КРУПНЫМИ ЗЕМЛЕВЛАДЕЛЬЦАМИ И МАРГИНАЛЬНЫМИ КАТЕГОРИЯМИ ШЛЯХТЫ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В КОНЦЕ XIX – НАЧАЛЕ XX в.

***М. А. Крентъ***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, mkrents@bsu.by*

В статье рассматриваются основные причины социального конфликта между крупными земледельцами и мелкой шляхтой на территории Беларуси